– сколько времени было затрачено на пошаговое продвижение по «лестнице достижений»?

– вспомните первые шаги, приведшие Вас к успеху в достижении высоких образовательных результатов?

Проходя самостоятельно вышеописанные этапы, каждый студент наполняет созданные им образы личностным смыслом, оценивает уже имеющиеся собственные ресурсы и фиксирует скачки своего профессионального роста.

**Заключение.** Применение коуч-технологии в изучении химических дисциплин преподавателями кафедры и самими студентами обеспечивает позитивные изменения в их отношении к учебному процессу: студенты из статуса пассивных слушателей переходят в категорию активных деятелей образовательной среды с положительной динамикой в формировании учебно-познавательной мотивации и личностной ответственности в самоопределении и саморазвитии.

1. Гульчевская, В. Г. Принципы и техники коучингового подхода как механизмы повышения эффективности образовательных технологий личностно-ориентированного обучения / В. Г. Гульчевская // Практические советы учителю. – 2015. – №9 (203). – С. 3-7.

2. Пырков, В. Е. Коучинговый подход в обучении старшеклассников как технология реализации современного математического образования / В. Е. Пырков // Труды XI Международных Колмогоровских чтений: сборник статей, Ярославль, 6-8 мая 2013 г. / МГУ им. Ломоносова; редкол.: В. В. Афанасьев (гл. ред.) [и др.]. – Ярославль, 2013. – С. 197-202.

3. Пырков, В. Е. Модель коучинговой службы в образовательном пространстве современного вуза / В. Е. Пырков // Fundamental and applied sciences today VII: Proceedings of the Conference. North Charleston, 21-22.12.2015, Vol. 3 – North Charleston, SC, USA: CreateSpace, 2016. – С. 89-91.

## АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧЭБНА-НАВУКОВА-ВЫТВОРЧАГА КОМПЛЕКСУ “ІМКНЕННЕ”

*І.В. Дзянісава[1], А.Д. Чарных[2]*
*[1]Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*
*[2]Віцебск, КГК “Залатое кола горада Віцебска «Дзвіна»”*

Павышэнне якасці прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў педагагічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава ажыццяўляецца ў тым ліку дзякуючы дзейнасці вучэбна-навукова-вытворчага комплексу (ВНВК) “Імкненне” на базе дзяржаўнай установы “Культурна-гістарычны комплекс «Залатое кола горада Віцебска ‘Дзвіна’»”. Арганізацыя навучальнага працэсу на падставе інтэграцыі адукацыйнай, навуковай і вытворчай дзейнасці змяшчае ў сабе значныя магчымасці для ўзмацнення практычнай падрыхтоўкі будучых педагогаў па спецыяльнасцях “Музычная адукацыя”, ”Музычнае мастацтва, рытміка і харэаграфія“, ”Пачатковая адукацыя“, ”Дашкольная адукацыя“, ”Алігафрэнапедагогіка“ і ”Спецыяльная і інклюзіўная адукацыя“.

Мэта публікацыі заключаецца ў характарыстыцы асноўных напрамкаў дзейнасці вучэбна-навукова-вытворчага комплексу “Імкненне”.

**Матэрыял і метады.** У ходзе даследавання выкарыстоўваліся тэарэтычныя (аналіз, абагульненне) і эмпірычныя (назіранне, апісанне) метады. Матэрыялам даследавання паслужылі дакументы, якія рэгламентуюць дзейнасць ВНВК “Імкненне” на базе дзяржаўнай установы “Культурна-гістарычны комплекс «Залатое кола горада Віцебска ‘Дзвіна’»”.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж дзяржаўнай установай “Культурна-гістарычны комплекс «Залатое кола горада Віцебска ‘Дзвіна’»” і ўстановай адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава» было заключана ў 2018 годзе. Пасля заканчэння яго тэрміну дзеяння ў 2023 годзе было падпісана новае пагадненне. Акрамя таго, у 2019 годзе была заключана дамова аб прак-

тыцы студэнтаў, таму што значная ўвага пры планаванні дзейнасці вучэбна-навукова-вытворчага комплексу надаецца ўзмацненню практычнай накіраванасці падрыхтоўкі будучых педагогаў. Кіраўніком ВНВК "Імкненне" з'яўляецца дацэнт кафедры музыкі ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат педагагічных навук І.В. Дзянісава. Непасрэдны ўдзел у планаванні працы і дзейнасці ВНВК прымае дырэктар культурна-гістарычнага комплексу "Залатое кола горада Віцебска «Дзвіна»" А.Д. Чарных.

Дзейнасць вучэбна-навукова-вытворчага комплексу ўключае розныя напрамкі ўзаемнага супрацоўніцтва і ажыццяўляецца згодна з каляндарным планам. Так, у сферы вучэбнай дзейнасці на пастаяннай аснове для студэнтаў дзённай і завочнай формаў навучання праводзяцца майстар-класы па традыцыйных відах народных рамёстваў, тэматычныя экскурсіі па выставах. Як правіла, найбольшую цікавасць у студэнтаў выклікаюць майстар-класы па вырабе шумавых музычных інструментаў з гліны, віншавальных паштовак у тэхніцы выцінанкі, лялек-абярэгаў з нітак.

Студэнты педагагічнага факультэта наведваюць выставы, святы і кірмашы, якія праходзяць у культурна-гістарычным комплексе "Залатое кола горада Віцебска «Дзвіна»". Пад кіраўніцтвам выкладчыкаў будучыя педагогі прымаюць актыўны ўдзел у адкрыцці абсалютнай большасці выстаў, дзе кожны ўдзельнік мерапрыемства можа пачуць з першых вуснаў аповед пра гісторыю і тэхніку стварэння творчых работ, выказаць сваё меркаванне, а таксама задаць пытанні аўтару.

З мэтай папулярызацыі тэхнікі роспісу па сырой эмалі "Віцебская маёліка" і ўзмацнення практычнай накіраванасці падрыхтоўкі будучых педагогаў сістэматычна арганізуюцца і праводзяцца майстар-класы для студэнтаў (у тым ліку – з Кітайскай Народнай Рэспублікі) дзённай і завочнай формаў атрымання вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях педагагічнага факультэта. Асваенне ведаў народнай культуры магчыма толькі праз актыўную творчую дзейнасць і свядомы ўдзел у ёй праз правядзенне практычных семінараў, майстар-класаў, майстар-шоў, прэзентацый і выстаў.

Значным накірункам працы ВНВК "Імкненне" з'яўляецца навуковая дзейнасць. Штогод па заказу культурна-гістарычнага комплексу выконваюцца дыпломныя работы і магістарскія дысертацыі, прысвечаныя вывучэнню і захаванню культурных, адукацыйных, мастацкіх традыцый Віцебскага рэгіёна. Вынікі праведзеных даследаванняў абмяркоўваюцца на навукова-практычных канферэнцыях і прадстаўляюцца ў сумесных з супрацоўнікамі культурна-гістарычнага комплексу навуковых артыкулах [1–3].

Адным з найбольш значных напрамкаў дзейнасці ВНВК "Імкненне" у галіне вытворчасці з'яўляецца арганізацыя і правядзенне вучэбнай харавой практыкі студэнтаў другога курсу спецыяльнасці ”Музычнае мастацтва, рытміка і харэаграфія“. Паспяховаму правядзенню практыкі спрыяе ажыццяўленне цеснага супрацоўніцтва з творчымі калектывамі і аматарскімі аб'яднаннямі культурна-гістарычнага комплексу "Залатое кола горада Віцебска «Дзвіна»", сярод якіх – народны ансамбль народнай песні ”Сябрына“, народны хор ветэранаў, ансамбль народнай музыкі ”Жалейка“. Будучыя педагогі не толькі наведваюць рэпетыцыі, але і прымаюць у іх актыўны ўдзел. Такім чынам праводзіцца падрыхтоўка студэнтаў да працы з непрафесійнымі (аматарскімі) і аўтэнтычнымі фальклорнымі калектывамі мастацкай творчасці і аматарскімі аб'яднаннямі. З дапамогай супрацоўнікаў культурна-гістарычнага комплексу практыканты рыхтуюць вакальныя і вакальна-інструментальныя творчыя нумары для ўдзелу ў мерапрыемствах celebrated рознага ўзроўню.

Адным з вынікаў супрацоўніцтва стала падрыхтоўка студэнтаў педагагічнага факультэта да ўдзелу ў розных творчых і навуковых конкурсах. Напрыклад, К. Данілюк атрымала дыплом I ступені ў намінацыі «прадметы побыту» Рэспубліканскага конкурсу "Капітал месца" (2021) і таксама прымала ўдзел у выставе-прэзентацыі ў рамках

рэспубліканскага мерапрыемства “Віцебск – моладзевая сталіца Рэспублікі Беларусь-2022” з праектам “Віцебская маёліка: роспіс па сырой эмалі“ (2022). Лаўрэатамі III ступені І-га гарадскога адкрытага фестывалю літаратурнай казкі імя Лазара Лагіна сталі аўтары казкі “Сплюшык”, студэнты педагагічнага факультэта А. Фунцікава і А. Хлудэнка (2023).

Падрабязныя звесткі пра найбольш значныя і цікавыя мерапрыемствы ВНВК “Імкненне” своечасова размяшчаюцца на афіцыйным сайце ВДУ імя П.М. Машэрава.

**Заключэнне.** Такім чынам, з 2018 года дзейнасць вучэбна-навукова-вытворчага комплексу (ВНВК) “Імкненне” на базе дзяржаўнай установы “Культурна-гістарычны комплекс “Залатое кола горада Віцебска “Дзвіна” ажыццяўляецца з мэтай вывучэння і захавання традыцый у галіне адукацыі, культуры і мастацтва Віцебскага рэгіёна. Асноўнымі напрамкамі дзейнасці ВНВК “Імкненне” з'яўляюцца навукова-даследчая, творчая, навучальная і вытворчая. Вялікая ўвага надаецца практычнай накіраванасці падрыхтоўкі студэнтаў да будучай прафесійнай дзейнасці. Штогод праводзіцца каля пяцідзесяці сумесных мерапрыемстваў, у якіх бяруць удзел студэнты і супрацоўнікі педагагічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава.


1. Сохранение регионального историко-культурного наследия: витебская майолика / И.В. Денисова [и др.] // Искусство и культура. – 2022. – № 2 (46). – С. 33–37.
2. Дзянісава, І.В. Вучэбна-навукова-вытворчы комплекс «Імкненне» у сістэме прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў педагагічнага факультэта / І.В. Дзянісава, А.Д. Чарных, Н.В. Карабанава // Современное образование Витебщины. – 2022. – № 2 (36). – С.55–58.
3. Денисова, И.В. Организация и проведение учебной хоровой практики студентов на базе учебно-научно-производственного комплекса «Імкненне» / И.В. Денисова, Е.Д. Черных // Наука – образованию, производству, экономике [Электронный ресурс] : материалы 75 Регион. науч.-практ. конф. преподавателей, науч. сотрудников и аспирантов, Витебск, 3 марта 2023 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: Е.Я. Аршанский (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2023. – С. 732–734.


## ПСИХОЛОГИЧЕСКАЯ ГОТОВНОСТЬ БУДУЩИХ ПЕДАГОГОВ К РЕАЛИЗАЦИИ ПРИНЦИПА ИНКЛЮЗИИ В ОБРАЗОВАНИИ


*С.В. Лауткина, В.А. Мухина*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


В Республике Беларусь, как и во всем мире, наблюдается неуклонный рост детей с особенностями психофизического развития (ОПФР). Так, в Республиканском банке данных Республики Беларусь (ведется с 1998 г.) по состоянию на 15.09.2022 г. содержится персонифицированная информация о 179,4 тыс. детей, на 15.09.2023 г. – 183,2 тыс. (прирост почти 4000 детей; такая тенденция сохраняется из года в год); из них 16 тыс. детей имеют инвалидность.

Кроме того, современный этап развития образования характеризуется новой педагогической парадигмой, в соответствии с которой основными идеями образования становятся идеи *гуманизации, фундаментализации, интеграции.* Эти концептуальные идеи определяют целью образования обеспечение полноценной и достойной жизни человека с ОПФР, что предполагает включение человека во все виды социальных отношений при обеспечении его индивидуальности и самобытности. В аспекте идеи фундаментализации переосмысливается содержания понятий «норма» и «патология», уменьшается категоричность в трактовке этих понятий. В свете идеи интеграции/инклюзии обосновываются и реализовываются формы совместного обучения и воспитания детей с ОПФР и нормотипичных. По отношению к образованию ЮНЕСКО понимает инклюзию как процесс «*обращения и реагирования на разнообразие потребностей всех обучающихся через участие в обучении, культуре и сообществах, и сокращении отказа от*